аналітычны. Яны маюць сваю спецыфіку і накіраваны на тое, каб пры мастацкай рэканструкцыі былі захаваны рэгіянальныя асаблівасці, мастацкі стыль, а сама імпрэза ці вытворчасць адбыліся без празмерных высілкаў; каб працэсам была ахоплена мэтавая аўдыторыя і рэканструкцыя праходзіла з выхаваўчым, асветніцкім эфектам. Найбольш удалыя прыклады комплекснай мастацкай рэканструкцыі звычайна звязаны з заснаваннем і дзейнасцю музеяў-скансэнаў.

### ЛІТАРАТУРА

1. Купальскі спеўнік: метадычны дапаможнік / аўтар-укл. Т. Пладунова. – Мінск: Інстытут культуры Беларусі, 2013. – 160 с. : іл.

## МАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРА Ў ФАЛЬКЛОРЫ

**Матэрыяльная культура ў фальклоры** – *апісанне элементаў традыцыйнага аддзення, прылад працы і аздаблення жылля носьбітаў традыцыі ў помніках іх вуснай народнай творчасці, а таксама тэхналогіі народных рамёстваў, якія перадаюцца вусным шляхам.* Адна з апошніх дэфініцый па традыцыйнай культуры вуснага тыпу – «нематэрыяльная культурная спадчына» (прапанаваная ЮНЭСКА ў 2003 годзе) – уключае «ўзоры вуснай народнай творчасці і тэхналогіі рамёстваў». Гэта невыпадкова, паколькі тэхналогіі вытворчасці, якія гістарычна скдаліся і сталі традыцыйнымі, грунтуюцца на ручной працы, звязаны са светапоглядам і адаптацыяй этнасу. Часта традыцыйныя віды артэфактаў і спосабы іх дэкаратыўнага аздаблення адлюстроўваюць міфалогію і народную эстэтыку або дапаўняюць іх семіятычна, у асаблівасці ў тым выпадку, калі фрагменты вуснай народнай творчасці страчаны або існуюць у латэнтным (схаваным) выглядзе (касмаганічная сімволіка велікодных яек-пісанак). Магчымыя і «зваротныя» працэсы, калі фальклорныя крыніцы дапамагаюць аднавіць згубленыя тэхналогіі рамёстваў (рэканструкцыя беларускай дуды як мастацкага і культурнага феномену ў XXI стагоддзі).

### ЛІТАРАТУРА

1. *Калацэй, В.* Параўнальная міфалогія / В. Калацэй. – Мінск: Зорны верасень; Паркус плюс, 2009. – С. 46 – 48, 43.

## МЕТАД ДЭМАНСТРАТЫЎНАЙ АНТРАПАТЭХНІКІ

**Метад дэманстратыўнай антрапатэхнікі** (ад *ст.-грэч.* ἄνθρωπος – чалавек і *лац.* dēmonstrātiō – звяртанне ўвагі, паказванне) – *традыцыйная*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ